УДК 821.161.3 «19»09+929 [К. Чорны]

*А.М. Мельнікава*

# ХРЫСЦІЯНСКАЯ ДАМІНАНТА ТВОРАЎ КУЗЬМЫ ЧОРНАГА

У артыкуле асэнсоўваюцца хрысціянскія матывы ў творах класіка беларускай літаратуры Кузьмы Чорнага, чыя спадчына істотна паўплывала на станаўленне нацыянальнай мастацкай традыцыі. Паказваецца, што імкненне пісьменніка да ўсталявання спагадлівых узаемаадносін паміж людзьмі, сцвярджэнне чуласці, любові, міласэрнасці, дапамогі адпавядаюць хрысціянскім прынцыпам. У гады Вялікай Айчыннай вайны Кузьма Чорны адкрыта звяртаецца да Усявышняга. Робіцца выснова пра значны этычны патэнцыял беларускага мастацкага слова.

Істотны ўплыў на развіццё нацыянальнай мастацкай свядомасці мела творчасць Кузьмы Чорнага. Яна аказала значнае ўздзеянне на фарміраванне светапоглядных асноў духоўнага жыцця беларускага народа ўвогуле. Ідэйна-светапоглядныя ўстаноўкі пісьменніка блізкія да хрысціянскай этыкі і маралі. Гэта праблема фактычна не разглядалася айчынным літаратуразнаўствам. Мэта артыкула – сцвердзіць значнасць маральна-этычнага патэнцыялу творчасці Кузьмы Чорнага. Задача – даследаваць хрысціянскія матывы ў творах празаіка.

Нягледзячы на тое, што сталенне пісьменніка, сама яго творчасць разгортваліся ў часы панавання ідэй класавай нянавісці, варожасці, Кузьма Чорны сцвярджаў неабходнасць усталявання спагадлівых, чулых узаемаадносін паміж людзьмі. Адна з вызначальных у творчасці Кузьмы Чорнага – тэма міласэрнасці, спачування. Хрысціянскія матывы ў творах пісьменніка ўвогуле досыць выразныя. Л. Корань падкрэсліла: «Не сказаць пра Кузьму Чорнага і хрысціянства – усё роўна, што мець на ўвазе Дастаеўскага-атэіста» [1, с. 86]. Зразумела, што Кузьма Чорны не мог адкрыта гаварыць пра хрысціянскія каштоўнасці, але сваёй творчасцю ён гэтыя каштоўнасці сцвярджаў. І перш за ўсё – хрысціянскі запавет Любові: «Прыказанне новае даю вам, каб вы любілі адзін аднаго; як Я узлюбіў вас, каб і вы адзін аднаго любілі» [Ян. 13:34]. Гэты запавет вызначае паводзіны Мані Ірмалевіч, Казіміра Ірмалевіча, Радзівона Цівунчыка, Ваці Браніслаўца (раман «Сястра»), Волечкі Нявада, фельчара (раман «Пошукі будучыні»), Ганны (апавяданне «Радасць жанчыны»), Любы Лук'янскай, Макаркавых Волькі, гераіні апавядання «Маленькая жанчына».

Для пісьменніка чуласць увогуле – адзін з найважнейшых паказчыкаў чалавечай вартасці, своеасаблівы індыкатар чалавечнасці. Такой мяккай, чулай паўстае жанчына ўжо ў самых першых творах празаіка – апавяданнях «Радасць жанчыны», «Па дарозе», «Захар Зынга», раманах «Сястра», «Зямля». У апавяданні «Радасць жанчыны» яго галоўная гераіня Ганна жыве пры старэйшым браце, які, «сарваны цяжкаю працай», часта «ўпікаў Ганну дармаедствам, а Ганна яго шкадавала…» [2, с. 114]. Вядома, што праз пакуты, згодна з хрысціянскай этыкай, адбываецца духоўны рост чалавека. У апавяданні «Па дарозе» пісьменнік наступным чынам характарызуе маці галоўнага героя Паўла: «Была жанчына старая і часта насіла ў сабе нейкі вострy настрой. Бо гэта яна многа перажыла была за жыццё бяды і гора, і гэта зрабіла яе чулай навекі» [2, с. 152]. У апавяданні «Захар Зынга» пісьменнік так перадае стан гераіні: «…адчула замілаванне дачкі да хворага бацькі», «ён ёй здаваўся слабым і немагушчым, якога трэба даглядаць і не спускаць з вачэй» [2, с. 248]. Гераіня рамана «Зямля» Ганна не цешыцца з мужчынскай увагі, а перажывае, што стала прычы-

най пакутаў добрага чалавека, Алеся. Тэма ўзаемаразумення паміж людзьмі, спачування – скразная тэма апавяданняў Кузьмы Чорнага са зборніка «Хвоі гавораць».

Істотнае месца ў поглядах Кузьмы Чорнага займае думка пра неабходнасць чалавечай еднасці, «агульнасці», што таксама блізкае да хрысціянскіх прынцыпаў. Ужо ў апавяданні «На беразе» герой гаворыць: «Самае галоўнае, у сабе не закайвайся, а жыві ў людзях» [2, с. 74]. Ва ўсведамленні сваёй еднасці з людзьмі, далучанасці да чалавечай супольнасці – радасць. Гэтае ўсведамленне надае героям пісьменніка пачуццё раўнавагі, упэўненасць: «І яшчэ адчуў ён, што гэтая блізкасць к лесніку, якая так раптоўна яго ўсяго абхапіла, і ёсць нешта такое, што патрэбна для радасці жыцця і можа служыць прычынай пакуль яшчэ няяснага, але вялікага дзела, якое карысна і неабходна для шчасця» [2, с. 83].

Пра «ўсясветную дбайнаць аб кожным чалавеку, які толькі хоць дзе на зямлі радзіўся на свет» [3, с. 205], піша Кузьма Чорны ў рамане «Млечны шлях». Празаік верыць у вялікую сілу чалавечай еднасці, у яе здольнасць пазбавіць чалавека пакут і няшчасцяў. Гэтая думка – цэнтральная ў апавяданнях «Дзень», «Новыя людзі», «У падвале», «Парфір Кіяцкі», «Захар Зынга», «Сцены» і інш. Героі Кузьмы Чорнага прагнуць гэтай блізкасці, еднасці чалавека з чалавекам: «…захацелася яму… пабегчы па зямлі, сазваць усіх і сказаць ім, моцна крыкнуць нешта такое, што б заставіла іх засмяяцца нявінна-дзіцячым смехам і адчуць да яго, Ігнася, радасную блізкасць – блізкасць людзей к чалавеку і чалавека к людзям» [2, с. 189]. Далучанасць да людзей натхняе герояў пісьменніка, узбагачае іх пачуцці, надае сэнс іх існаванню.

Пісьменнік упэўнены, што светам кіруюць законы дабра і прыгажосці: «І гэта тут вялікі закон выяўляе імкненне ўсяго да хараства, вялікую здольнасць усяго хаваць агіднасць і мізэрнасць; выяўляе можа цяжкую неабходнасць хаваць ад вачэй смерць у кветках і музыцы…» [2, с. 340]. Гэтае сваё перакананне ён жадае данесці да чытачоў.

У творах Кузьмы Чорнага афармляецца канцэпцыя жыцця як радасці: «…усё тое, што кругом напаўняе жыццё, ёсць нешта слаўнае, добрае, загэтым і дае яно радасць самому жыццю» [2, с. 76], «вось хаджу я па зямлі, жыву – і ад гэтага радасць. Яна шырыцца, яна ва ўсім, што ёсць, яна напоўніць усё, уздыме чалавека ў яго захапленнях. Яна ў свядомасці, што я існую і адчуваю ўсё» [2, с. 195], «жыццё шырокае, яно само ў сабе, нават як факт ужо існавання – радаснае» [2, с. 224]. Як у апостала Паўла: «Радуйцеся заўсёды ў госпадзе; і йзноў кажу: радуйцеся» [Флп. 4:4–7].

Гэта думка з твора ў твор праходзіць у Кузьмы Чорнага. Сэнс жыцця пісьменнік бачыць у самім жыцці, у яго шматлікіх праявах: «Сэнс і мэта жыцця хаваецца ва ўсім тым, што акружае чалавека, сустракаецца на кожным кроку. Зразумеўшы, адчуваючы гэта, вучыцель стаў, а пасля і навучыўся знаходзіць радасць жыцця ў працы, у людзях, у кожным кавалку зямлі, ва ўсякай з'яве» [2, с. 77]. Гэтае ўспрыманне жыцця як бясконцага дару таксама блізкае да хрысціянскіх падыходаў. Кузьма Чорны ўсведамляе каштоўнасць любога тварэння прыроды, што вынікае з усведамлення неабвержнай каштоўнасці жыцця ўвогуле, «пакланення перад жыццём» (А. Швейцэр). Пісьменніку ўласціва своеасаблівая «сімпатыя», пранікнёнасць у жыццё: «І ўсё хацелася пайсці па зямлі, ахваціць яе сабою і сказаць кожнаму: вось я бачу, чую, адчуваю цябе. І пачынаю адчуваць тое, чаго ты і сам можа не адчуваў…» [2, с. 306], «і хацелася выявіць перад усім тым, што ёсць, што вось адчуваецца яно, гэта жыццё» [2, с. 308]. Пачуццёвасць – вызначальная рыса твораў Кузьмы Чорнага 20-х гадоў. Тое, пра што піша празаік, прасякнута асабістым успрыманнем, бачаннем: «Хмурна думаць пачало неба, і тады ж зямля весялілася ветрам» [2, с. 314], «адчуў ён востра-вясёлы холад асенняга вечара, вялікую задуменнасць нерухомых дрэў за нізкай каменнай сцяной і нейкае чулае пачуццё зямлі і ўсяго, што на ёй існуе…» [2, с. 357]. Рэчаіснасць у мастака насычана гукамі, колерамі, пахамі. Ён адлюстроўвае жыццё ва ўсім яго пачуццёвым,

матэрыяльным багацці. Адсюль і віталізм твораў пісьменніка, багацце, разнастайнасць фарбаў, маляўнічасць пры апісанні прыроды.

Вядомы праваслаўны прапаведнік А. Шмеман у сваіх дзённіках пастаянна піша пра жыццё як Божы дар, пра сапраўдную рэальнасць быцця: «Страшэнная памылка сучаснага чалавека: атаясамліванне жыцця з дзеяннем, думкай і г. д. і ўжо амаль поўная нягдольнасць жыць, гэта значыць адчуваць, успрымаць, «жыць» жыццё як бесперапынны дар. Ісці на вакзал пад дробным, ужо вясеннім дажджом, бачыць, адчуваць, усведамляць рух сонечнага промня па сцяне – гэта не толькі «таксама» падзея, гэта і ёсць сама рэальнасць жыцця. Не ўмова для дзеяння і для думкі, не іх безуважны фон, а тое, па сутнасці, дзеля чаго і варта дзейнічаць і асэнсоўваць. І гэта так таму, што толькі ў гэтым дае нам Сябе адчуць і Бог, а не ў дзеянні і не ў думцы» [4, с. 15].

Кузьма Чорны ўспрымае чалавека як істоту гарманічную, якая прагне суладнасці ў пачуццях. Усё, што тычыцца чалавечых перажыванняў, мае для пісьменніка глыбокі сэнс і значэнне: «І ўсё, самае нават малое, праходзячы праз людскія пачуцці, поўна было вялікага сэнсу» [2, с. 340]. Пісьменнік развівае думку пра значнасць і вялікасць чалавека.

На працягу ўсяго творчага шляху Кузьму Чорнага надзвычай хвалявала праблема «адвечнага прыгнечання духу»: здзеку над чалавекам, прыніжэнне чалавека чалавекам, страх перад моцнымі гэтага свету. «Адвечнае прыгнечанне духу» і нарадзіла чорнаўскіх герояў-трапетуноў. Пісьменнік імкнецца ўзняць чалавека «над вялікай нізасцю, што напаўняе нас з глыбіні вякоў…» [5, с. 35]. Істотным для Чорнага было пазбаўленне ад такога становішча, калі адзін чалавек мае ўладу над другім. Гэта думка – адна з цэнтральных у рамане «Сястра»: «Шалёна спрачаліся мы тут наконт урачыстасці чалавека над чалавекам» [5, с. 165]. Празаік перакананы, што чалавек павінен пазбавіцца ўсяго, што «псуе вялікае хараство чалавека» [2, с. 299], пазбавіцца страху, галечы, прыніжанасці, «дробных хітрыкаў»: «Не, ты пакінь згінаць плечы свае ў прысутнасці каго б там ні было. Сам увесь перарадзіся…» [5, с. 169].

Кузьма Чорны пісаў: «Галоўнае, што мучыць мяне з самых маладых год маіх, гэта пакуты чалавека на зямлі, якія ў нас яшчэ не знішчаны і за знішчэнне якіх мы ўсе цяпер змагаемся» [6, с. 70]. Вызваленне ад страху, прыніжанасці – мэта, якой прагнуў беларускі празаік.

Кузьма Чорны піша, што праяўленню любові, спачування, спагады перашкаджаюць не толькі знешнія ўмовы, беднасць, нястачы («…Марцінюк думаў… аб сваім жыцці ў маладыя гады ў страшнай беднасці. І як адносіны ў іх вялікай сям'і адзін да аднаго былі дрэнныя… Адзін аднаго толькі шкадавалі, але не любілі…» [2, с. 457]), але і ўласная чэрствасць чалавека. І быццам жыццё наладжваецца, становіцца лепшым, а людзі застаюцца абыякавымі адзін да аднаго. Кузьма Чорны лічыць, што адчуць, успрыняць пакуты і боль іншага чалавека здольны толькі той, хто сам зведаў няшчасці і боль: «Ён глядзеў на яе твар – малады і прыгожы. Адценні бесклапотнасці ляжалі на ім, і загэтым давялося ў гэты момант несвядома адчуць яму, што не было на твары гэтым адзнакаў вострых па глыбіні сваёй дум і перажыванняў…» [2, с. 458].

Чалавечая адчужанасць, крыўда – менавіта ад цяжкага жыцця. Дзеля спагады, спачування неабходна душэўная раўнавага, а яе людзі не маюць: «Вакол, за працаю людзі далёка былі адзін ад другога» [2, с. 216].

Пісьменнік занепакоены тым, што ў імкненні да ажыццяўлення вялікай мэты вызвалення чалавечых сіл для творчасці, хараства, забыліся аб самім чалавеку, зрабілі з яго бяздумнага выканаўцу: «…гнуткаю цвёрдасцю свайго розуму, скамбінаваўшы прыродныя сілы і стварыўшы машыны, чалавек часам забыў, што ён тварэц іх, што іх

тупая сіла для яго. І, забыўшы гэта, пакланіўся жалезу…» [2, с. 458]. Відавочныя алюзіі тут на тагачасную грамадскую сітуацыю.

Кузьма Чорны сцвярджаў думку пра значнасць, каштоўнасць чалавечай асобы, што таксама сугучнае хрысціянскім устаноўкам: кожны чалавек пакліканы. Таму пісьменнік балюча ўспрымаў усялякія захады падпарадкаваць, увесці чалавека ў нейкія рамкі: «Найдрабнейшае каліва травы – незаўважанае ці даўно забытае, – і яно можа калі-небудзь увайсці раптам у жыццё чалавека, заняць увагу і думкі, і няма тае рамы, у якую можна было б, нават самаму моцнаму з моцных, увагнаць гэтую з'яву з малым калівам травы. А якую адлегласць трэба вымераць ад травы да чалавека?» [2, с. 501].

Скразная думка твораў Кузьмы Чорнага – неабходнасць унутранага ўдасканалення, духоўнага ачышчэння, пазбаўлення ад усякай нізасці, «дробных хітрыкаў і ўласнае прыніжанасці», што ізноў жа адпавядае хрысціянскай этыцы.

У рамане «Сястра» пісьменнік звяртаецца да скразной у яго творчасці праблемы – праблемы суперажывання чалавека чалавеку, спагады, дапамогі. Адна з галоўных гераінь твора – Маня Ірмалевіч. Кузьма Чорны ўжо ў самым пачатку рамана акрэсліў сутнасць вобраза гераіні – чуласць, разуменне: «І раптам вырасла яна ў яго ўяўленні – з малое, паважнае нейкае ў словах сваіх, якою ён ведаў яе заўсёды і бачыў апошні раз, – вырасла яна раптам у вобраз сталай жанчыны – сястры, уведаўшай нейкі сэнс ці то ўсе адценні жыцця» [5, с. 9]. Нездарма і раман мае назву «Сястра». Аналогіі з сястрой міласэрнасці. Гэта значыць, для пісьменніка было важна сцвердзіць гэту чуласць, разуменне. Гераіню рамана «Сястра» Кузьма Чорны характарызуе як «пакутніцу за ўсё і над усім» [5, с. 140]. Адна з вызначальных ідэй рамана – сцвярджэнне любові да бліжняга. Кузьма Чорны пастаянна падкрэслівае Маніну дабрыню: «Нават і думкі яе мелі пачатак свой у сэрцы» [5, с. 113], «… і як гэта яна павінна была апекавацца над усімі і клапаціцца аб іх» [5, с. 114].

Астатнія героі адчуваюць у Мані яе дабрыню і цягнуцца да яе, давяраюць свае перажыванні. Маня нясе з сабою ўсё самае лепшае: яна надае ўпэўненасці, моцы Вацю, з яе з'яўленнем цяплее душой Казімір. Маня на многае расплюшчвае яму вочы. І найперш на тое, як важна, каб побач з чалавекам быў нехта, хто б разумеў і падтрымліваў яго.

Маня – гэта ўвасабленне чысціні, справядлівасці. І ў многім менавіта яе стаўленне да астатніх герояў з'яўляецца паказчыкам іх чалавечай вартасці. Яна як бы суддзя іх учынкаў. Якраз Маня здолела зразумець Вацю Браніслаўца і тое, што яму неабходна дапамагчы ў яго пошуках. Маня не прымае жорсткай пазіцыі «жалезнага» Абрама Ватасона. Гераіня дае людзям тое спачуванне, якое ім так неабходна, да якога імкнуцца героі рамана. Яна менавіта зацікаўлена іншым чалавекам, яго жыццём, клопатамі. Такім чынам, Кузьма Чорны піша пра важнасць Сустрэчы, сустрэчы чалавека з чалавекам. Побач з Маняй у Казіміра Ірмалевіча ўпершыню з'яўляецца патрэба расказаць пра свае справы, абуджаецца жаданне і самому дапамагчы іншаму чалавеку: «Ён чуў у яе ўважлівасці зацікаўленасць чалавека чалавекам – тым, які займаецца гэтаю вось працай. І тут узнімалася ў ім патрэбнасць самому паглыбіцца ў тое, што прымусіла яе гаварыць кагадзе пра Вацю Браніслаўца як пра чалавека, якому ніхто не дапамог пазбавіцца хістанняў яго на зямлі» [5, с. 199].

Казя пачынае ўсведамляць, што самае каштоўнае ў жыцці – разуменне, блізкасць да іншага чалавека. Гэта надае яму пачуццё радасці, раўнавагі: «…нешта ёсць большае, чым кожнадзённыя спрэчкі аб яго медычных формулах, чым тыя адносіны з яго таварышамі, працаўнікамі клінікі, якія зусім знікаюць тады, калі кончыцца спрэчка аб формулах і яны разыдуцца. Гэтае вялікае і патрэбнае тут от, у гэтую хвіліну, выразна выяўлялася ў тым, што яму было радасна ад таго, што яна блізка тут, каля яго, што яна напісала тады некалі першы ліст да яго, што яны зноў спаткаліся на гэтых жыццёвых дарогах, такіх шырокіх і радасных…» [5, с. 199–200]. Казя прагне чалавечай блізкасці. Яшчэ ў маленстве ўсё бунтавала ў Казі пры сутыкненні з людской засяроджанасцю

толькі на ўласных клопатах і жыцці, няўважлівасці да іншага. Казя разумее, што паміж людзьмі не павінна быць крыўды, недаверу, злосці, бо гэта атручвае жыццё, не дае адчуць радасці ад блізкасці чалавека да чалавека: «Ты жыла ўжо шмат самастойна і дагэтуль не навучылася расцаніць нашу былую непрыязнь як непатрэбную дробязь, зняважлівую для чалавека» [5, с. 73].

Шукае людской спагады і Радзівон Цівунчык. Чалавечнасць – тое, што найперш вылучае героя. «Слаўным чалавечнасцю», «клапатлівым, як бацька» называе героя пісьменнік. Цівунчык часта наракае, што людзі ачарсцвелі душою, што іх адносіны паміж сабой абмяжоўваюцца толькі нейкімі справамі: «І, гаворачы аб справе, дык ён твой першы прыяцель. А калі пачнецца, скажам, трохі іначай, от, скажам, бяда якая ў цябе на душы ляжыць або гора якое, значыць, душу табе душыць, – то тады ты маўчы з ім. Не гавары нічога, а то кпіны будзе строіць, не дай бог. Ён жа чалавечае душы не прызнае» [5, с. 132].

Цівунчык – увасабленне чалавечнасці ў яе, так сказаць, аголеным, безабаронным выглядзе. Любое праяўленне абыякавасці, чэрствасці балюча адбіваецца ў душы героя. І наадварот, людская спагада, чуласць адгукаецца ў ім удзячнасцю і дабрынёй. Цівунчык гатовы дапамагчы любому чалавеку і да любога праяўляе самую жывую і шчырую зацікаўленасць. Гэтую чалавечнасць, дабрыню Цівунчыка адчувае Ваця: «Думалася яму цяпер, што толькі адзін чалавек ёсць – стары Радзівон Цівунчык, які несвядома разумеў самую сутнасць сутнасці тых, з кім сустракаецца. І з ім Вацю можна было б гаварыць або хоць моўчкі сядзець доўга і прыемна» [5, с. 276]. Цівунчык увесь час імкнецца быць бліжэй да людзей, прымае іх клопаты як свае ўласныя. Менавіта стаўленне Цівунчыка, «слаўнага чалавечнасцю», з'яўляецца істотным у разуменні сутнасці герояў. І менавіта Браніслаўца ён вылучыў і палюбіў больш за астатніх. І Ваця ў сваю чаргу адчувае чалавечнасць Цівунчыка. У Абраме ж Цівунчык расчараваўся, адчуўшы няўважлівасць таго да людзей.

Кузьма Чорны адмаўляе людскую размежаванасць, адчужанасць, усё тое, што аддаляе чалавека ад чалавека. Умоўнасць не дазваляе зразумець Вацеваму таварышу, як той піша ліст малазнаёмаму чалавеку. А ліст гэты, між тым, надзвычай усхваляваў і абрадаваў Цівунчыка. Ізноў жа ўмоўнасць не дае спакою Малюжычу, калі ён спрабуе ўладкаваць Маню на работу. Герою непрыемна, што могуць узнікнуць перасуды, хоць ён і лічыць іх дробязнымі. Пасля ж Малюжыч быў вельмі задаволены, што дапамог чалавеку: «Цяпер вельмі добра. Наогул жа, усё гэта нейк аж урэзалася ў маё асабовае жыццё. Ведаеш ты, гэта так бывае часам, пасля чаго некаторыя людзі, гэтыя самыя, што так выпадкова сустракаюцца на дарозе, пачынаюць быць блізкімі…» [5, с. 185].

Тэма чуласці, спагады, спачування гучыць і ў рамане «Трыццаць год». Пра Колю Высоцкага Кузьма Чорны піша: «Ён ненавідзеў усялякі здзек, шанаваў і паважаў чалавечыя пакуты і слёзы…» [7, с. 335].

У рэшце рэшт, у творах 40-х гадоў, адчуваючы набліжэнне смерці, калі можна было не аглядацца на цэнзуру, Кузьма Чорны адкрыта загаварыў пра Усявышняга. Да Усявышняга звяртаюцца героі рамана «Пошукі будучыні» ў хвіліны роспачы і адчаю – Нявада («Божа, памажы мне, каб усё так і было добра, тады я зберагу яе, малую, дзеля таго, што добрае будзе, памажы мне выратаваць яе» [3, с. 114]), Ракуцька («Ліза асталася там, Божа найвышшы!» [3, с. 115]); героі рамана «Млечны шлях»: «Божа, – шапталі яго губы, – няхай бы ты быў і існаваў і зрабіў бы так, каб яна пад агнём даўно ўжо была нежывая» [3, с. 215].

У рамане «Вялікі дзень» Кузьма Чорны звяртаецца да біблейскіх вобразаў, вобраза Іова. Паказальным з'яўляецца ўнутраны маналог Андрэя Мішурына: «Як толькі мог, ён стараўся не падацца непераможнаму жаданню сказаць гэтым няшчасным людзям: мая душа прагне, каб які-небудзь вялікі і ўсёмагутны бацька

сказаў мне: «Любы мой сын, мне відны твае пакуты, спадзявайся на маю ласку да цябе, я люблю цябе і шкадую» [3, с. 407]. Менавіта страсны заклік Кузьмы Чорнага да ўсталявання чалавечных, спагадлівых адносін адзін да аднаго – сведчанне хрысціянскага пачатку светапогляду пісьменніка.

Цікавую заўвагу адносна назвы рамана «Пошукі будучыні», яе хрысціянскага зместу зрабіла Г. Бутырчык: «Ужо сама назва рамана сімвалічная, бо пошук – гэта заўжды рух, імкненне, шлях да спасціжэння сябе і Сусвету, які найперш патрабуе веры ў спрадвечныя чалавечыя каштоўнасці – дабрыню, спагаду, міласэрнасць» [8, с. 49]. І далей даследчыца працягвае: «Відавочна, што вобразы вялікага скрыжавання, вялікага дрэва, вялікага каменю – гэта вобразы аднаго парадку, якія акцэнтуюць у творы праблему маральнага выбару і ў кантэксце біблейскай вобразнасці могуць быць разгледжаны як трансфармацыі вобраза Хрыста. Адпаведна, вобраз вялікага злодзея ёсць увасабленнем інфернальнага зла, ці ідэі антыхрыста. Такая інтэрпрэтацыя вобраза становіцца магчымай пры суаднясенні яго з вобразам вялікага інквізітара Ф. Дастаеўскага, чыя творчасць значна паўплывала на мастацкі свет Кузьмы Чорнага» [8, с. 49].

У рамане «Млечны шлях» пісьменнік разважае над хрысціянскай праблемай спачування і даравання. Ці можна дараваць фашысту, забойцу дабрыні і спачування: «Фашыст і чалавек. Вось яны два, адзін аднаму напроці. Калі нам суджана пабіць фашыстаў і калі мы пашкадуем іх, збітых, і будзем гаварыць, што і яны людзі, то хто так можа гаварыць, калі я не дарую! Хіба можа яны ўсе, …так як рабілі некалі вялікія злачынцы, каючыся, адзенуць на сябе адзежу з зрэбных мяхоў на цэлае стагоддзе і самі аддадуць усе сілы, каб узрасціць у шчасці тое пакаленне ў чалавецтве, якое ў сваім маленстве зазнала на сабе фашысцкі бот…» [3, с. 202]. Уладзімір Ярмаліцкі змагаецца сам з сабою. У яго душы супрацьстаяць літасцівасць і спагадлівасць з нянавісцю да забойцаў жыцця і радасці. Убачыўшы спакутаванага, на мяжы жыцця і смерці, чалавека, Ярмаліцкі «забыўся быў і на свае пакуты». Але калі герой зразумеў, што гэта немец, яго пачуцці змяняюцца: «Душа мая гнала вон усялякае спачуванне» [3, с. 202]. І менавіта гэтага свайго развароту ад спачування і чалавечнасці не можа дараваць Ярмаліцкі фашызму: «Гэта была новая мая пакута: бачыць чалавека перад пагібеллю і ў няшчасці і не мець сілы выйсці з чэрствасці і халоднасці! Я ўзненавідзеў яго за тое, што ён прывалокся на маю родную зямлю, адабраў у мяне радасць. Загнаў мяне ў аглоблі і не дазволіў мне быць і далей мяккім і добрым, літасцівым і лагодным перад чужой пакутай» [3, с. 202].

У рамане «Млечны шлях» Кузьма Чорны піша пра холад, што сыходзіць ад чалавека, які не мае веры: «… то ў гэтага толькі адна рыса панавала над усім. Гэта – абыякавасць. Холадам павявала ад яго вачэй і нерухомых губ і сабранага ў нерухомыя маршчыны лба. Але холад не пераходзіў у абсалютны спакой і нават не межаваўся з ім. Абыякавасць, нерухомасць, зморанасць, расчараванне… І паняверка. Без усялякай веры быў чалавек. І гэтае бязвер'е і было яго тым жарам, што дзесьці яшчэ тлеў у яго душы. Пакута ад таго, што няма веры» [3, с. 175].

Галоўны клопат Мікалая Сямагі – пільнаваць душу дачкі ад ачарсцвення ў гэты жорсткі час: «Як магу, я пільную яе душу, каб яна не абязвечылася і захавалася такая, якая і была змалку» [3, с. 208].

Кузьма Чорны пакутліва разважае над тым, адкуль столькі гора, няшчасцяў, чаму людзі здольныя на забойствы, на нянавісць, ці засталося нешта чалавечае ў чалавеку: «Ці ты верыш, што чалавек не вытрымае, каб вечна быць зверам? Вырві ты з чалавека сэрца і ўстаў на яго месца звярынае, дык у чалавечых грудзях і звярынае сэрца стане чалавечым» [3, с. 116]. Нягледзячы на ўсе жахі, выпрабаванні, якія даводзіцца пераадольваць яго героям, пісьменнік перакананы: «Як свет стаіць, то яшчэ не было вядома, каб на нянавісці вырасла шчасце. А радасць на чужой бядзе» [3, с. 124–125].

Нельга не ўзгадаць і апошнія словы пісьменніка з яго «Дзённіка»: «…Божа, напішы за мяне мае раманы, хіба так маліцца, ці што?» [6, с. 521].

Такім чынам, скразной ідэяй творчасці Кузьмы Чорнага была ідэя чалавечнасці, сцвярджэнне спагадлівасці, дабрыні – хрысціянскія каштоўнасці. Ён балюча ўспрымаў любыя захады ціску на чалавека, занядбання яго пачуццяў. Вызначальнае для пісьменніка – гуманнае стаўленне да чалавека, вызваленне яго ад стану прыніжанасці і пакутаў. У жорсткі век класавага супрацьстаяння Кузьма Чорны гаварыў, імкнуўся сцвердзіць галоўнае: ідэі Любові, суперажывання, спагады, – што сведчыць пра магутны маральны патэнцыял як твораў самога пісьменніка, так і беларускай літаратуры ўвогуле.

Вынікі даследавання могуць выкарыстоўвацца пры стварэнні новага пакалення падручнікаў і навучальных дапаможнікаў, пры складанні праграм па беларускай літаратуры, у працэсе далейшага вывучэння гісторыі нацыянальнай літаратуры, творчасці Кузьмы Чорнага, пры выкладанні літаратуры ў вну і школе.

## СПІС ЛІТАРАТУРЫ

1. Корань, Л. Цукровы пеўнік : літ.-крыт. арт. / Л. Корань. – Мінск : Маст. літ., 1996. – 286 с.
2. Чорны, К. Збор твораў : у 8 т. / К. Чорны ; пад рэд. А. Адамовіча. – Мінск : Маст. літ., 1972. – Т. 1: Апавяданні 1923–1927 гг. – 544 с.
3. Чорны, К. Збор твораў : у 8 т. / К. Чорны ; пад рэд. А. Адамовіча. – Мінск : Маст. літ.,1973. – Т. 6: Раманы «Пошукі будучыні», «Млечны шлях», «Вялікі дзень», аповесць «Скіп'ёўскі лес». – 520 с.
4. Шмеман, А., прот. Дневники. 1973–1983 / А. Шмеман ; сост., подгот. текста У.С. Шмеман, Н.А. Струве, Е.Ю. Дорман. – 2-е изд., испр. – М. : Русский путь, 2007. – 720 с.
5. Чорны, К. Збор твораў : у 8 т. / К. Чорны ; пад рэд. А. Адамовіча. – Мінск : Маст. літ.,1973. – Т. 3: Раманы «Сястра», «Зямля». – 533 с.
6. Чорны, К. Збор твораў : у 8 т. / К. Чорны ; пад рэд. А. Адамовіча. – Мінск : Маст. літ.,1975. – Т. 8: Публіцыстыка 1923–1944. Дзённік. Летапіс жыцця і творчасці. – 608 с.
7. Чорны, К. Збор твораў : у 8 т. / К. Чорны ; пад рэд. В.В. Барысенкі. – Мінск : Маст. літ., 1973. – Т. 7: П'есы. Няскончаныя раманы і аповесці. – 584 с.
8. Бутырчык, Г. У пошуках Бацькаўшчыны: вопыт тыпалагічнага даследу творчасці Джона Стейнбека і Кузьмы Чорнага / Г. Бутырчык. – Мінск : РІВШ БДУ, 2003. – 70 с.

***Melnikava A. M.* The Christian Dominant of Kuzma Chorny's Works**

Christian motives in the works of the classic of the Belarusian literature Kuzma Chorny are comprehended in the article. We can see that striving for establishment of responsive interrelation between people, assertion of comprehension, love, charity, help answer the Christian principles. In the years of the Great Patriotic War Kuzma Chorny appeals to the Almighty. Belarusian word of art has a significant ethical potential.

Рукапіс паступіў у рэдкалегію 27.01.2010